**А. Юркоўская**

# АДМЕТНАСЦІ СІМВОЛІКІ ВОДНАЙ СТЫХІІ Ў ТВОРЧАСЦІ І. ГЁТЭ І У. КАРАТКЕВІЧА

Першаасноваа быцця чалавека выяўляецца праз чатыры стыхіі. Усё жывое ўтрымлівае ў сабе ў пэўнай прапорцыі элементы агню і вады, цяпла і паветра. Для лірыкі У. Караткевіча і І. Гётэ характэрна асабліваe духоўнае

паяднанне з прыроднымі стыхіямі, якія яны малююць з незвычайнай экспрэсіўнасцю вобразна-выяўленчых сродкаў, псіхалагізаванасцю. Даследаванню акрэсленага пытання прысвечаны працы аўтарытэтных літаратуразнаўцаў: В. Шынкарэнка, А. Гардзіцкага., А. Вераб'я, Е. Бурмістаравай і інш. Праз сімволіку прыродных стыхій раскрываецца філасофская сістэма паэтаў, адметнасці іх светаўспрыняцця і асобаснай экзістэнцыі.

Вада з'яўляецца адной з асноўных касмічных стыхій так, як і Зямля, Паветра, Агонь. Яна звязваецца з пачаткам стварэння Сусвету, характарызуецца як увасабленне жаночага (які нараджае) пачатку. Разам з тым вада асэнсоўваецца як грозная, разбуральная стыхія. Адсюль, відавочна, і павышаная ўвага І. Гётэ і У. Караткевіча да гэтага вобраза.

Вада для У. Караткевіча і І. Гётэ – гэта асяроддзе зараджэння жыцця, сімвал усяго існага, а кропля – увасабленне асобы чалавека. Так, у сцэне марскога свята (другая частка «Фаўста») І. Гётэ праз вобразы марскіх і рачных бажаствоў выказвае свой погляд на эвалюцыю жыцця, якое ўзнікла ў марскіх глыбінях. У паэзіі У. Караткевіча водная стыхія прадстаўлена ў вобразе рэк і азёр, якія займаюць ледзь ці не першаснае значэнне ў індывідуальнай абмалёўцы родных мясцін паэта, у першую чаргу, Оршы. Стыхія вады ў лірыцы аўтара – сведка гісторыі, сімвал памяці народа і ачышчэння.

Мастацкае асэнсаванне воднай стыхіі ў лірыцы і І. Гётэ, і У. Караткевіча мае выражаны нацыянальны кантэкст. У цыкле «Кароткія Ксеніі» ў І. Гётэ сустракаюцца вершы, пабудаваныя на антытэзе: вада, мора – зямля, камень. Даследчык Т. Дзітцэль трактуе гэта як сімвалічнае апісанне двух станаў грамадства: застой і рэвалюцыйнае хваляванне. Для У. Караткевіча азёры і рэкі – гэта, у першую чаргу, спосаб выражэння ўласнай нацыянальнай ідэнтычнасці.

Даследаванне спецыфікі мастацкага асэнсавання сімволікі воднай стыхіі ў паэзіі І. Гётэ і У. Караткевіча дазваляе вылучыць асаблівасці філасофскага асэнсавання карціны свету ў нацыянальным і агульначалавечым кантэкстах, вылучыць тоесныя і выразна самабытныя рысы ў светаадчуванні беларускага і нямецкага народаў. Сістэмны разгляд дадзенага пытання прадуктыўны для развіцця айчыннай філасофскай, літаратуразнаўчай і эстэтычнай думкі.